ГУК «Барановичская районная централизованная библиотечная система»

**ГУК «БАРАНОВИЧСКАЯ РАЙОННАЯ ЦЕНТРАЛИЗОВАННАЯ БИБЛИОТЕЧНАЯ СИСТЕМА»**
**ОТДЕЛ КОМПЛЕКТОВАНИЯ, ОБРАБОТКИ И ОРГАНИЗАЦИИ ЕДИНОГО ФОНДА**

"МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА"
выдавецтва

# Обзор книжных новинок Белорусской литературы 1 квартал 2024 года Литературного издательства «Мастацкая літаратура»

Новая Мышь, 2024

Подготовила: Толох И. П. - библиотекарь отдел комплектования, обработки и организации единого фонда

**В рубрике «Новые поступления в библиотечный фонд» мы знакомим пользователей с новыми поступлениями литературы в систему. Вашему вниманию предлагаем литературу на любой вкус и возраст, для самых маленьких читателей и родителей, для учащихся школ, книги для учебы и для души.**

**О каждой новинке вы получите всю необходимую информацию: внешний вид издания, аннотацию.**

**Надеемся, эта информация будет полезна и интересна читателям.**






# Васіль Быкаў

## Творы

**аповесці**

**серыя «Залатая калекцыя беларускай літаратуры»**

**50 тамах; т. 27**

**У 27-ы том серыі «Залатая калекцыя беларускай літаратуры» ўвайшлі самыя знакамітыя аповесці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава (1924-2003) «Жураўліны крык», «Альпійская балада», «Сотнікаў», «Пайсці і не вярнуцца» і «У тумане», якія даўно сталі класікай беларускай літаратуры.**






# Янка Мавр

## Полесские робинзоны
## В стране райской птицы

**повести**

**серия «Мир классики детям»**

**Янка Мавр (1883–1971) — один из основателей белорусской детской литературы, основоположник приключенческого и научно-познавательного жанров в белорусской литературе, создатель первой белорусской научно-фантастической повести. Его произведения «Полесские робинзоны» и «В стране райской птицы», которые составляют эту книгу, давно стали классикой и входят в золотой фонд белорусской литературы.**

**Перевод с белорусского языка.**






# Иван Серков

## Мы с Санькой в тылу врага
## Мы — хлопцы живучие

**повести**

**серия «Мир классики детям»**

**Иван Серков (1929-1998) — один из ярких детских писателей Беларуси. Его произведения «Мы с Санькой в тылу врага» и «Мы — хлопцы живучие», которые пошли в эту книгу, о жизни обыкновенных деревенских ребят — Ване и Саньке. Их деревню оккупировали фашисты в первые месяцы войны. Тяжёлые испытания выпали на долю Вани и Сашки, их родных и близких.**

**Для среднего и старшего школьного возраста**






# Іван Чыгрынаў

# Раман. Апавяданні

Гэтае выданне працягвае кніжны праект «Народная бібліятэка». Народная, бо кнігу склалі творы, якія выбралі самі чытачы: гэта такія хрэстаматыйныя творы, як

Раман: Плач перапёлкі

Апавяданні: Ці бываюць у выраі ластаўкі?; За сто кіламетраў на абед; Шчаслівае месца; У баку ад дарогі; Адна ноч; Дзічка; Адна; У ціхім тумане; Бульба; Дзівак з Ганчарнай вуліцы






# Алесь Кожедуб

## Партрэт

**раман, апавядані**

**У кнігу пісьменніка Алеся Кажадуба ўвайшлі раман «Партрэт» і апавяданні, напісаныя ў апошнія гады. Раман «Партрэт» расказвае пра маладога чалавека, які спрабуе сябе ў навуковай дзейнасці і на тэлебачанні, аднак вымушаны схіліць галаву перад яе вялікасцю Літаратурай. А ў жыцці, як вядома, трагічнае заўсёды побач з камічным.**

**Прозу А. Кажадуба вылучаюць імклівы сюжэт, пластычная мова, дакладныя дыялогі, тонкі гумар.**

**Раман «Партрэт» друкуецца ў аўтарскай рэдакцыі.**






# Еўдакія Лось

## Яснавокія мальвы

**вершы, паэмы**
**серыя «Новая бібліятэка беларускай паэзіі»**

**Зорка Еўдакіі Лось (1929—1977) зазіхацела на небасхіле беларускай паэзіі ў 50-я гады мінулага стагоддзя. І хоць пражыла паэтэса ўсяго 48 гадоў, яе творчасць стала яркай і самабытнай з’явай у айчынным прыгожым пісьменстве. Яна пісала прозу, займалася перакладамі, многія свае творы адрасавала юным чытачам, і ўсё ж самыя яркія, пранікнёныя і незабыўныя радкі можна знайсці ў яе грамадзянскай ды інтымнай лірыцы. Кнігу «Яснавокія мальвы» склалі выбраныя вершы і паэма «З белых пялёсткаў» з літаратурнай спадчыны**






# Аркадзь Куляшоў

## Паміж наступным і былым

**вершы**

**серыя «Новая бібліятэка беларускай паэзіі»**

**У гэтай кнізе народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова (1914—1978) чытач знойдзе лепшае з творчай спадчыны выдатнага пісьменніка, які ўзбагаціў нашу літаратуру рамантычна адухоўленай, высокаметафарычнай, напоўненай багаццем філасофскіх вобразна-асацыятыўных сувязей і адначасова ў найвышэйшых сваіх праявах глыбока інтымнай, прапушчанай праз жывое трапяткое сэрца паэзіяй.**




# Янка Брыль. Сірочы хлеб
# Іван Навуменка. Дзяцінства
# Міхась Стральцоў.
# Адзін лапацьадзін чунь

**серыя «Бібліятэка беларускай аповесці»**

**Творы, якія ўвайшлі ў зборнік, даўно сталі класікай айчыннай літаратуры. Усе іх аб’ядноўвае тэма дзяцінства. Дзеянне аповесці Янкі Брыля «Сірочы хлеб» адбываецца ў былой Заходняй Беларусі, якая ў 1921 годзе трапіла пад уладу Польшчы. Лёс Даніка ў многім адлюстроўвае лёс самога пісьменніка, яго дзяцінства і вучобу ў школе. У значнай ступені аўтабіяграфічная аповесць Івана Навуменкі «Дзяцінства» пераносіць нас у перадваенны час і расказвае пра жыццё местачковага хлапчука Васіля Войціка. Сюжэт аповесці Міхася Стральцова «Адзін лапаць, адзін чунь» таксама шмат у чым перагукваецца з лёсам самога аўтара. Яго герой — хлопчык Іванка — з пакалення дзяцей вайны, якая толькі што закончылася, але на сэрцы кожнага з герояў твора пакінула свой чорны след.**






# Алесь Савіцкі

## Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка

**апавесць-казка**

**Жыў-быў у маленькім вадаёме залацісты карасік Бублік. Жыў ціха, спакойна. І раптам у падводным царстве адбылася незвычайная падзея, якая змяніла жыццё маленькага вадаёма... Якая? Адказ на гэта і другія пытанні юны чытач знойдзе, калі прачытае цікавую і займальную апавесць-казку вядомага беларускага пісьменніка Алеся Савіцкага.**






# Міхась Лынькоў

## Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў

**аповесць-казка**

**Галоўныя героі аповесці – медзведзяня Мішка, казёл Барадаты і сабака Жук, якія думаюць, разважаюць і паводзяць зусім як людзі.**

**Аўтар з гумарам апісвае прыгоды сяброў на грамадзянскай вайне. Аповесць насычаная вясёлымі, смешнымі і разам з тым павучальнымі гісторыямі.**

**Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту**






# Максім Багдановіч

## Добрай ночы, зара-зараніца!

**вершы**

**серыя «Жывая класіка дзецям»**

**Кніга сапраўднага класіка беларускай літаратуры Максіма Багдановіча для маленькіх чытачоў — аздобленае яскравымі малюнкамі выданне з вершамі на розныя тэмы. Выдатная кніжка для самастойнага чытання і чытання з бацькамі**

**Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту**




# Хлеб – усяму галава

**творы беларускіх пісьменнікаў пра хлеб**

**Хлеб беларусы цэняць, паважаюць, шануюць. І любуюцца ім. Бо ён напраўду прыгожы – і калі ляжыць на стале бохан, і калі трымаеш у руцэ акраец, і калі частуеш каня духмянай скібкай. А хлеб дае моц беларусам і натхняе пісьменнікаў на вершы, казкі і апавяданні.**

**Вазьміце лусту хлеба, разгарніце кнігу – і насалоджвайцеся.**

**Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту**




# Зімовыя дзівосы

**Казкі, апавяданні і вершы**
**серыя «Пачытайчык»**

**У кнізе вы трапіце ў казачны свет, у якім зможаце здзейсніць з Пачытайчыкам незвычайныя падарожжы. Дзякуючы нашаму герою вы пазнаёміцеся з беларускай прыродай, яе жыхарамі і зможаце даведацца пра іх шмат цікавага. Таксама ў кнізе ёсць народныя прымаўкі і прыказкі, цікавыя факты пра розныя з’явы.**

**У кнізе, на абароце вокладкі, ёсць код-пароль, дзякуючы якому вы адчыніце, а потым згуляеце ў прапанаваныя гульні з Пачытайчыкам. Напрыклад, адкажаце на пытанні па кнізе, разгадаеце крыжаванку, пройдзеце лабірынт і гэтак далей. Для гэтага на сайце «Мастацкай літаратуры» ва ўкладцы «Інтэрактыўныя гульні» трэба спампаваць электронны дадатак на камп’ютар.**

**Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту**




# Вясна-чараўніца

**Казкі, апавяданні і вершы**
**серыя «Пачытайчык»**

**Працягвай з Пачытайчыкам падарожжа ў свет радасці, кветак і весялосці, якая прымусіць улюбіцца ў вясну яшчэ больш і ўзбудзіць жаданне даследаваць і адкрываць новае вакол сябе.**

**У кнізе ёсць код-пароль, дзякуючы якому вы згуляеце ў прапанаваныя гульні з Пачытайчыкам. Для гэтага трэба спампаваць электронны дадатак на камп’ютар.**

**Для дзяцей малодшага школьнага ўзросту**

# СПАСИБО
# ЗА
# ВНИМАНИЕ!

**Телефоны для более подробного уточнения :**
**Отдел обслуживания: 64-25-66(взрослое отделения)**
**64-25-63 (детское отделение)**
**46-19-42; 40-28-09 (отдел комплектования)**
**На сайте http://rcbs-bar.by/**
**размещён электронный каталог**